# ЕСЦЬ КАДРЫ, ГАТОВЫЯ ДА ПРАЦЫ І АБАРОНЫ!

## ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО
## ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОВУ
## СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ

### *АДКРЫТАЕ ПІСЬМО АД ВЫПУСКНІКОЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА*

Сёння мы, выпускнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта — фізікі, хімікі і біалогіі — адзначаем сваё паспяховае заканчэнне курсаў універсітэта. **І першая наша думка ў гэты вялікі для нас дзень накіравана да велізарнейшага правадыра ўсяго працоўнага чалавецтва і кіраўніка сацыялістычнай будоўлі Савецкага Саюза — да вялікага СТАЛІНА**, да ленінска-сталінскай партыі і савецкага ўрада, якія далі магчымасць нам, сынам рабочых, калгаснікаў атрымаць вышэйшую адукацыю і ўвайсці ў камандны склад будаўнікоў нашай сацыялістычнай радзімы.

У той час, калі ў краінах капітала перад працоўнай моладдзю толькі адна перспектыва — шлях да беспрацоўя, шлях да цемры і голаду, у нас, у краіне сацыялістычнай працы і культуры, перад кожным працоўным расчынены дзверы ў творчае і радаснае жыццё.

Інжынеры, настаўнікі, навуковыя работнікі, лабаранты і даследчыкі — і кожны патрэбны нашай маладой прыгожай радзіме.

Знаходзячыся на ўніверсітэцкай скамейцы, мы асабліва адчувалі бацькаўскія клопаты савецкага ўрада аб нас, аб савецкім студэнцтве, простае і непасрэднае кіраўніцтва ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР, простыя і непасрэдныя клопаты аб нас тт. Гікало, Чарвякова, Галадзеда.

Свядомы працоўны перадак, сацыялістычныя адносіны да працы, барацьба за якасць сваіх паказальнікаў — вось асноўнае, што выхаваў у нас савецкі ўніверсітэт. З яго сцен мы выходзім з вялікімі ведамі, бадзёрымі, радаснымі і поўнымі энтузіязма і ўпэўненасці ў поспех сваёй будучай практычнай работы ў школе, лабараторыі, інстытуце.

Нас выхоўвала ўся наша сацыялістычная краіна на прыкладах геройскай працы і адвагі сваіх лепшых сыноў і дачок, на гіганцкіх

Адыходзячы на практычную работу, мы цвёрда помнім словы таварыша Сталіна, што кадры закаляюцца толькі на жывой рабоце ў барацьбе з труднасцямі ў перамозе іх. І мы будзем дастойнымі нашай вялікай эпохі ўкладам у самае каштоўнае, што накоплена чалавецтвам — у кадры.

Выходзячы са сцен універсітэта і выражаючы падзяку яго прафесарска-выкладчыцкаму складу і кіраўніцтву універсітэта за шчырыя адносіны да сваёй справы і непасрэдныя клопаты аб якасці нашых ведаў, мы заяўляем, што не парвём сувязі з універсітэтам. Мы яшчэ многа, многа чаго палепшым у яго вытворчай і выхаваўчай рабоце. Кожны з нас на сваім участку будзе дамагацца гэтага. Многія будуць выкладаць у школах дастойныя для вышэйшай навучальнай установы кадры, многія займуцца навуковай работай у інстытутах, лабараторыях і ўсе разам будуць заняты адной справай, справай

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**